гараджане вымушаны былі перайсці да больш сур'езных формаў барацьбы (дастаткова ўзгадаць паўстанне магілеўскіх мяшчан у 1618 г. і ўзброенае выступлення віцяблян у 1623 г., калі быў забіты полацкі архіепіскап Іясафат Кунцэвіч [4. С. 188]).

Да сярэдзіны XVII ст. відавочным стала размежаванне ў асяроддзі гараджан: вылучылася вярхушка гарадскога насельніцтва, якая прыняла уніяцтва, і нізы, якія засталіся вернымі праваслаўю [1. С. 58]. Пратэст супраць палітыкі насаджэння уніяцтва выліўся ў сярэдзіне XVII ст. у нацыянальна-вызваленчую барацьбу супраць РП. У выніку паўстання 26 кастрычніка 1648 г. гарадскія нізы ў Пінску разграмілі касцел Пінскай іезуіцкай калегіі. Падчас паўстання вясной 1653 г. у Магілеве гараджане выгналі з горада уніяцкага епіскапа Злотко Квашына. Наступны ўсплеск антыўнійнай барацьбы ў Беларусі быў звязаны з падзеямі вайны 1654-1667 гг. Асаблівай актыўнасцю адрозніваліся гараджане Пінска, Турава, Давыд-Гарадка, Бярэсця. Пасля вайны ў Беларусі зноў узмацнілася рэлігійнае прыгнячэнне, аднаўляліся каталіцкія і уніяцкія храмы [4. С. 234]. У адказ на гэта разгарнулася новая хваля вызваленчага руху. Жыхары Мінска байкатавалі уніяцкія храмы. Праваслаўныя жыхары Полацка ў снежні 1681 г. у дзень свята прысвятой дзевы Марыі падпалілі прыгатаваны феерверк і неаднаразова пагражалі жыццю уніяцкага мітрапаліта [3. С. 245]. Відавочна, што гараджане ўсходніх раёнаў Беларусі адрозніваліся большай актыўнасцю ў параўнанні з заходнімі.

Такім чынам, у перыяд умацавання уніяцкай царквы на беларускіх землях гараджане былі аднымі з тых, хто цвёрда стаяў на пазіцыях аховы праваслаўя, выкарыстоўваючы розныя сродкі барацьбы – ад пратэстаў да паўстанняў.

**Літаратура**

1. Гайдук Н. Брестская уния 1596 г. – Мн., 1996. – 191 с.

2. Киприанович Г.Я. Исторический очерк православия, католичества и унии в Белоруссии и Литве. – Вильно, 1899. – 286 с.

3. Мараш Я.Н. Из истории борьбы народных масс Белоруссии против экспансии католической церкви. – Мн., 1969. – 263 с.

4. Уния в документах: Сб. / сост. В.А. Теплова, З.И. Зуева. – Мн., 1997. – 520 с.

## РОЛЬ ШЛЯХТЫ В ПОЛИТИЧЕСКОЙ И КУЛЬТУРНОЙ ЖИЗНИ ВЕЛИКОГО КНЯЖЕСТВА ЛИТОВСКОГО И РЕЧИ ПОСПОЛИТОЙ

***К.Н. Шелягович***

Научный руководитель – к.и.н., доцент ***Д.Н. Хромченко***

*Белорусский национальный технический университет*

Работа посвящена одной из малоизученных тем. Она позволяет вскрыть истоки, движущие силы внутренней и внешней политики Великого княжества Литовского и Речи Посполитой, тех государств, в которые входили земли нынешней Беларуси.

Целью работы является изучение участия белорусской шляхты во внутриполитическом процессе и культурной жизни своего государства XIV – XVIII веков, а также ее влияние на внешнюю политику Великого княжества Литовского и Речи Посполитой. Много лет подряд в нас вбивали представление о Беларуси как об исключительно крестьянской, бедной и забитой стране. Это стремление властей показать белорусскую нацию как крестьянскую и, лишь в некоторой степени, городскую – особенно усилилось в первой половине XX века, когда властям надо было опереться на крестьян, а все остальные слои общества считались реакционными, в том числе и шляхта.

Исследование позволит сделать вывод: зарождение сословия феодалов и шляхты было вызвано развитием общества – переходом от первобытно-общинного общества к феодальному. И что именно позиция шляхты, ее внутригосударственная политическая деятельность явилась, в конечном счете, одной из наиболее глубинных и главных причин вхождения Беларуси в состав Речи Посполитой, а феодальная анархия, которая господствовала в Речи Посполитой, повлияла на то, что белорусские земли вошли в состав Российской империи.

Шляхта активно влияла и на внутреннюю и на внешнюю политику соседствующих

государств. Это обусловлено значительно большим, по сравнению с другими странами, количеством представителей этого сословия и особенностями политического строя. При этом прослеживаются два направления внешнеполитической деятельности: окатоличенная шляхта западных регионов Беларуси содействовала сближению с Польшей, православная шляхта восточной Беларуси – с Московским государством. Но, даже после потери части своих политических и экономических прав, после вхождение Беларуси в состав Российской империи, она сохранила свое влияние в высших слоях общества и царское правительство вынужденно было считаться с мнением представителей белорусской шляхты. И только со второй половины XIX столетия её роль в политической жизни постепенно снижается.

Работа основана главным образом на документальных материалах, научной литературе, монографиях и периодической печати.

## РАЗВІЦЦЁ І СТАН АДУКАЦЫІ НА ВЁСЦЫ Ў ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ

***Н.К. Юргевіч***

Навуковый кіраўнік – д.гіст.н., прафесар ***А.У. Русецкі***

*Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава*

Мэта даклада – выявіць асноўныя шляхі па пераадольванню цяжкасцей на вёсцы ў галіне адукацыі пасля Вялікай Айчыннай вайны. Аднаўленне сістэмы адукацыі ў БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны адбывалася ў надзвычай складаных умовах. Па-першае, была знішчана матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў навукі, адукацыі і культуры, многія выкладчыкі загінулі. Па-другое, беларуская вёска знаходзілася ў вельмі цяжкім становішчы, бо фактычна яна аднаўлялася з руін. Архіўныя дакументы сведчаць, што дзяржаўныя расходы на асвету былі значнымі, але асноўны ўклад у школьнае будаўніцтва ў пасляваенныя гады ўносілі працоўныя калектывы калгасаў, гарадскіх прадпрыемстваў, якія выдзялялі транспарт, набывалі будаўнічы матэрыял для школ, удзельнічалі ў суботніках і нядзельніках [1. Ар.177]. Гэтая праблема доўга заставалася вострай, бо нават у 1949 г. у БССР 3,5 тыс. школ знаходзілася ў сялянскіх хатах па найму і не мелі самых элементарных умоў для працы [2. Ар.265]. Нягледзячы на складаныя ўмовы пасляваеннага разбурэння, дзяржавай рабіліся крокі па ўдасканаленню сістэмы адукацыі: быў ажыццёўлены пераход да навучання з сямігадовага ўзросту, уведзена абавязковая здача ў 4 і 7 класах экзаменаў, а ў 10 класе – экзаменаў на атэстат сталасці, за поспехі ў вучобе для лепшых вучняў былі заснаваны залаты і сярэбраны медалі згодна пастанове Саўнаркома СССР ад 30 мая 1945 года [1. Ар.8]. Трэба падкрэсліць, што вялікай праблемай пасля вайны перад усімі райана і аблана было выяўленне дзяцей у гарадах і вёсках для навучання ў школах. Асноўнымі прычынамі ненаведвання дзецьмі школ з'яўляліся бадзяжніцтва, праца па гаспадарцы, беднасць ( не было адзення, абутку) [3. Ар. 61]. Вострай праблемай пасляваеннага часу было забеспячэнне школ кадрамі кваліфікаваных работнікаў. Прымаліся больш рашучыя дзеянні з боку аблвыканкама г. Віцебска, па загаду якога ўсім кіраўнікам прадпрыемстваў і арганізацый трэба было накіроўваць у распараджэнне аддзелаў народнай адукацыі настаўнікаў, працуючых не на педагагічнай рабоце, для работы па спецыяльнасці [1. С.125]. Дакументы сведчаць, што настаўніцтва не вельмі імкнулася павышаць сваю адукацыю, напрыклад, заяў на здачу ўступных экзаменаў было менш, чым прадпалагалася: у 1949 годзе ў Магілёўскім педвучылішчы на 100 месцаў паступіла 21 заява, у Гомельскім педінстытуце на 250 месцаў паступіла 27 заяў і г.д. [4 . Ар.285]. Трэба адзначыць, што з боку Міністэрства адукацыі БССР былі пэўныя мерапрыемствы з мэтай утрымання настаўнікаў на рабочым месцы ў вёсцы. Згодна пастановы № 246 ад 10 лютага 1948 года "О льготах и преимуществах для учителей начальных и семилетних школ" настаўнікам павінны былі прадастаўляцца кватэры, зямля для выпасу жывёлы і агарода, прадукты харчавання, аддзенне, дзеці настаўнікаў з 01.01.1949 года не плацілі за навучанне ў 8-10 класах сярэдніх школ, педагагічных вучылішчаў, вучылішчаў, інстытутаў [4. С.211]. Дарэчы, і зарплаты настаўнікаў у вёсцы былі ніжэйшымі, чым зарплаты настаўнікаў у горадзе [4. Ар.125]. На самой справе, мясцовыя ўлады не заўсёды сачылі за вырашэннем гэтых пытанняў, што выклікала хуткую зменлівасць і няўстойлівасць педагагічных кадраў.

Такім чынам, у гады чацвёртай пяцігодцы на стан вучэбна-выхаваўчай работы адмоўна